Чацвер, 18 Люты 2021

Віцебскі бізнесовец быў асуджаны на 7 сутак арышту за «чырвоную хвалю» на балконе

Друкаваць (/news/sud/item/3902-na-7-sutak-aryshtu?tmpl=component&print=1) | Эл. пошта (/component/mailto/?tmpl=component&template=lt_news&link=2fd6815cb260e1c2d8335594ebc744ae0a7512ac)

Ацаніць гэты матэрыял (9 галасоў)



(/media/k2/items/cache/0a9c4647017995b1a5a50326a05e6fcf_XL.jpg)

Віцебскі прадпрымальнік і дырэктар фірмы Уладзіміру Пунько правёў 7 сутак у ІЧУ за чырвоную паласу на ўласным балконе. Суд Кастрычніцкага раёну Віцебску прызнаў яго вінаватым у правядзенні несанкцыянаванага пікетавання (ч.3 арт. 23.34 КаАП). Суддзя Іна Грабоўская разглядала справу Пунько на выязным пасяджэнні ў ізалятары часовага ўтрымання.

Як і многія беларусы, **Уладзімір Пунько** пачаў праяўляць грамадзянскую актыўнасць пасля прэзідэнцкіх выбараў. Неаднаразова ўдзельнічаў у мірных шэсцях, за што ў кастрычніку 2020 году адбыў агулам 17 сутак арышту (па дзвюх справах). Тады ж, у кастрычніку, за чырвоную паласу на балконе быў складзены першы адміністрацыйны пратакол – паводле арт. 21.14 КаАП («Парушэнне правілаў добраўпарадкавання і

ўтрымання населеных пунктаў»). Разглядаць справу мелася спецыяльная камісія пры выканкаме, але чыноўнікі займацца гэтым не сталі – па сканчэнні тэрміну даўнасці справу спынілі.

Аднак 15 студзеня да Пунько прыехалі супрацоўнікі МУС і затрымалі дзяўчыну, аспірантку-медыка, якая гасціла ў яго. Яе даставілі ў Кастрычніцкі РАУС. Гаспадар кватэры паехаў у аддзяленне міліцыі, але быў там затрыманы і змешчаны ў ІЧУ.

Перш чым скласці пратакол, супрацоўнік міліцыі **Віталь Праліч** выставіў умовы: калі зафарбуе паласу на балконе – яго адпусцяць дамоў і пратаколу не будзе. Уладзімір адмовіўся.

> *«Гэта не сцяг, гэта вынік маіх памкненняў да прыгажосці, і зафарбоўваць не буду, бо мне падабаецца»*, – адказаў Уладзімір Пунько.

Трое сутак да суду, ад 15 да 18 студзеня, ён правёў за кратамі ІЧУ. На трэці дзень суддзя **Іна Грабоўская** прызнала яго вінаватым ва ўдзеле ў несанкцыянаваным пікетаванні і пакарала 7 суткамі арышту паводле ч.3 арт. 23.34 КаАП. Суд праходзіў у ізалятары.

Выйшаўшы на волю, прадпрымальнік так і не зафарбаваў *«чырвоную хвалю»* на балконе.

Уладзімір Бяляўскі

Апублікавана ў Суд (/news/sud)

Тэгі: Уладзімір Пунько (/itemlist/tag/Уладзімір%20Пунько) Іна Грабоўская (/itemlist/tag/Іна%20Грабоўская) ІЧУ (/itemlist/tag/ІЧУ) артыкул 23 34 КаАП (/itemlist/tag/артыкул%2023%2034%20КаАП)

Яшчэ ў гэтым разьдзеле: « Віцяблянка Яўгенія Пачэпка правяла двое сутак у ІЧУ – за сцяг на акне і майкі на балконе (/news/sud/item/3897-dvoe-sutak-u-ichu) 37 сутак і 140 базавых. Полацкі суд пакараў удзельнікаў шпацыру арыштамі і штрафамі » (/news/sud/item/3905-37-sutak-i-140-bazavykh)

Вярнуцца ў пачатак (/news/sud/item/3902-na-7-sutak-aryshtu#startOfPageId3902)

© 2011 - 2023 Віцебская вясна (/). Пры выкарыстаньні матэрыялаў абавязковая гіпэрспасылка. Email: vitebskspring@proton.me (mailto:vitebskspring@proton.me)

(Https(/Ht